

МУЖНАСЦЬ ГАРТАВАЛАСЯ Ў НЕБЕ

Іван Іларыёнавіч Камінскі нарадзіўся 8 лістапада 1919 года ў вёсцы Мяккія Сенненскага раёна. Пасля заканчэння Віцебскага аэраклуба ў 1939 г. па закліку ЦК ВЛКСМ «Камсамол — на самалёты!» паступіў у ваеннае авіяцыйнае вучылішча, якое закончыў перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны.

На фронце І. І. Камінскі ваяваў у якасці лётчыка-разведчыка. Зрабіў 239 баявых вылетаў, сфатаграфаваў 27 тысяч квадратных кіламетраў варожай абароны і ваенных аб'ектаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29 чэрвеня 1945 года.

З 1948 г. І. І. Камінскі — на партыйнай і савецкай рабоце ў Мінску. Памёр у 1974 г.



НЕБА яго прыцягвала з дзяцінства. Самалёты толькі зрэдку праляталі над іх вёскай, полем, і таму яны былі для хлопчыка асабліва таямнічымі і недасягальна далёкімі. А ў чацвёртым класе настаўніца, быццам здагадваючыся пра яго патаемную мару, сказала аднойчы на ўроку: «Ты, Ваня, абавязкова будзеш лётчыкам». І, звяртаючыся ўжо да ўсіх вучняў, дадала: «Вучыцеся, дзеці, як Камінскі, і перад вамі праляжа любая дарога...».

І сапраўды, Савецкая ўлада адкрывала перад кожным мноства самых захапляючых далей. Імкнуліся да святла ведаў вясковыя хлопцы і дзяўчаты, ехалі ў горад на вучобу, новабудоўлі. І Ваня Камінскі вырашыў ехаць у Віцебск, але толькі з адной адзінай мэтай: трапіць у авіяцыю, у неба, звязаць з імі сваё жыццё.

Ён ведаў, што ў абласным цэнтры ёсць аэраклуб. Але туды не так проста было паступіць: шмат жадаючых, строгі медыцынскі адбор. Камінскі прымае такое рашэнне: паступіць на педрабфак і, калі пройдзе камісію, вучыцца адначасова лётнай справе пасля заняткаў, у выхадныя дні. Так рабілі многія камсамольцы з заводаў і фабрык, навучальных устаноў.

Атрымалася, як і задумаў. Цяжка было, заўсёды не хапала часу, рэдка выпадала магчымасць наведаць родных. Але калі прыязджаў у вёску, там было сапраўднае свята. Івану не давалі праходу ні малыя, ні дарослыя. Ці ж жартачкі: ён, іх аднавясковец, зусім, як птушка, узнімаецца ў неба, яму давяраюць самалёт. І роспытам, размовам не было канца.

А потым — вучылішча лётчыкаў у горадзе Энгельсе, асваенне самых сучасных баявых самалётаў, цяжкая вестка пра напад гітлераўскай Германіі.

Рыхтаваўся Іван Камінскі, як і іншыя яго таварышы па групе, у бамбардзіровачную авіяцыю, але абставіны склаліся інакш: накіравалі лётчыка ў полк дальняй авіяразведкі. А гэта баявая служба патрабавала ад кожнага асобай падрыхтоўкі, асобага роду рызыкі. Бо разведчык, як вядома, павінен пазбягаць адкрытага бою, ён не мае права рызыкаваць здабытымі разведданымі, якія так неабходны камандаванню, і павінен саслужыць службу па-сапраўднаму вялікую, маштабную. Палёты на вялікіх вышынях, вывучэнне і авалоданне тэхнікай фатаграфавання розных аб'ектаў, абарончых палос праціўніка і цэлых раёнаў, працяглыя начныя палёты і палёты на поўны радыус далёкасці — каб асвоіць гэта належным чынам, патрабаваліся настойлівасць, вучоба, трэніроўкі. Гэтаму Іван Камінскі аддаваў сябе без астатку.

І вось першыя баявыя палёты, іх вынікі. З невялікай вышыні ўдалося сфатаграфаваць буйны варожы аэрадром, па ім тут жа нанеслі знішчальны ўдар нашы бамбардзіроўшчыкі. Па дакладных разведданых Камінскага ўзляцеў у паветра склад боепрыпасаў праціўніка, які быў старанна замаскіраваны ў лесе.

І ўсё гэта ў цяжкі, суровы час, калі гітлераўцы толькі і трызнілі пра захоп Сталінграда. За самалётамі-разведчыкамі палявалі літаральна дзесяткамі варожыя знішчальнікі, іх сустракалі ў небе суцэльнай сцяною агню зенітныя батарэі фашыстаў. Гінулі вопытныя лётчыкі, ветэраны палка, і іх месца павінны былі заняць дваццацігадовыя, такія, як Іван Камінскі. А гэта па сілах толькі валявым, патрабавальным да сябе паветраным байцам.

Суровы ўрок паднёс Камінскаму адзін выпадак, які адбыўся з ім у верасні 1942 года. Было атрымана заданне зрабіць разведку і фатаграфаванне дарог у раёне Арла, Болхава. На світанні самалёт узняўся ў паветра і ўзяў курс на захад. Паспяхова пераадолелі лінію фронту. Штурман Іваноў і стралок-радыст Ашын дакладвалі камандзіру, што ў паветры ўсё спакойна, не бачна небяспекі і з зямлі.

Гэта настройвала на дабрадушнасць, якая дорага потым абышлася. Не прадпрыняўшы неабходных супрацьзенітных манеўраў, Камінскі ўключыў над Болхавам фотаапараты, і тут жа адчуў, што самалёт моцна скалануўся.

Ад разрыву зенітнага снарада загарэўся правы матор. Рэзка разварочваючыся, каб узяць курс у зваротны напрамак, машына імкліва ўходзіла з зоны зенітнага агню, пакідаючы за сабой касмылі дыму і полымя.

Да гонару лётчыка, тут ён не разгубіўся; імгненна прыняў правільнае рашэнне. Хутка агонь быў збіты, але правы матор не працаваў. І так на адным, левым, удалося працягнуць каля паўсотні кіламетраў да сваёй тэрыторыі. Але і другі матор пачаў здаваць ад перагрэву, самалёт рэзка цягнула ўніз.

Шкада было губляць машыну, іх тады яшчэ так не хапала, і Камінскі вырашыў пасадзіць самалёт прама на поле. І тут экіпаж напаткала яшчэ адна цяжкасць: з-за туману, які рассцілаўся ад Акі, не бачна было зямлі. Скакаць з парашутамі таксама было позна: вышыня складала ўсяго некалькі дзесяткаў метраў.

Праўда, і на вайне іншы раз выпадае нечаканая ўдача. На вышыні літаральна ў дзесяць метраў прабіўся разрыў у тумане, лётчык ясна ўбачыў поле з усімі прадметамі на ім. Паспеў яшчэ скіраваць машыну ўбок і пазбегнуць немінучага сутыкнення з метэавышкай, што нечакана ўзнікла наперадзе. А потым самалёт ударыўся аб зямлю, падскочыў, праляцеў яшчэ колькі метраў, і яшчэ ўдар...

Машына разбілася, але экіпаж цудам уцалеў. Камінскі першы апрытомнеў, дапамог таварышам вылезці з-пад абломкаў, перавязаць раны. Самалёт звалiўся на тэрыторыі, дзе былі нашы войскі, і неўзабаве ўдалося звязацца з палком, далажыць камандаванню пра ўсё, што адбылося.

Гэта быў урок, які многаму навучыў Камінскага. У наступныя гады вайны яму давялося яшчэ шмат разоў вылятаць на разведку тылоў ворага, але дзякуючы майстэрству, якое сам здабываў, строгаму захаванню ўсіх неабходных мер засцярогі пры сустрэчы з праціўнікам — няхай ён у небе, ці на зямлі — баявыя заданні кожны раз выконваліся паспяхова, без значных страт.

Вось радкі з загаду камандавання ад 18 красавіка 1943 года: «За смелыя і ўмелыя дзеянні пры разведцы войск праціўніка і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм узнагародзіць ордэнам Айчыннай вайны I ступені пілота асобнага разведвальнага авіяпалка І. І. Камінскага».

Родная Беларусь... Ён зноў убачыў яе праз гады цяжкіх выпрабаванняў зверху, з кабіны свайго самалёта, усю параненую, але нескароную. І кожны раз, сустракаючыся з ёю ў час чарговага палёту на разведку варожых аб'ектаў у Віцебску, Оршы, Мінску, Камінскі са слязамі на вачах шаптаў: «Мы адпомсцім за цябе, родная зямля! Вызвалім кожную тваю пядзю...».

А потым агнём зенітных батарэй чырвоназоркавую машыну старшага лейтэнанта Камінскага сустракала неба Літвы, Польшчы. Напярэдадні аднаго з наступленняў яму пашчасціла выявіць буйную групоўку варожых войск, з вышыні ў 2000 метраў сфатаграфаваць гэты ўмацаваны раён з магутнай абаронай. План наступлення камандаванне тут жа скарэкціравала, варожы кулак нашы часці абышлі з поўначы і поўдня, ён трапіў у акружэнне і быў знішчаны. Дзякуючы каштоўным звесткам паветранай разведкі ўдалося выратаваць многія жыцці савецкіх воінаў.

У лютым 1945 года ў час адной з разведак самалёт Камінскага атакавалі сем «месершмітаў». Разгарэўся бой. Адзін варожы сцярвятнік удалося збіць. Але задымiў і наш самалёт. Да апошняй магчымасці лётчык вёў машыну ў бок свайго пярэдняга краю. Толькі паспеў Камінскі выкінуцца з парашутам, як самалёт тут жа ўзарваўся ў паветры. Лётчык страціў прытомнасць, ён быў цяжка паранены. Больш года давялося Камінскаму праляжаць у шпіталі на вылячэнні.

Тое раненне не дазволіла Івану Іларыёнавічу зноў вярнуцца ў неба. Дэмабілізаваўшыся з арміі, ён закончыў партыйную школу і з уласцівай яму энергіяй, працавітасцю ўключыўся ў аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Некаторы час працаваў у Міністэрстве дзяржкантролю рэспублікі, затым быў выбраны сакратаром райкома партыі аднаго з раёнаў беларускай сталіцы, некалькі гадоў узначальваў Фрунзенскі райвыканком г. Мінска. З 1971 года і да апошніх сваіх дзён І. І. Камінскі працаваў у апараце Дзяржплана БССР.

Здзіўляюча адданым сваёй дзіцячай і юнацкай мары быў гэты чалавек. Любоў да неба, авіяцыі Іван Іларыёнавіч пранёс праз усё жыццё. Некалькі гадоў яшчэ пасля дэмабілізацыі ён, заняты нялёгкімі службовымі клопатамі, знаходзіў час наведваць аэраклуб, займацца там на роўных правах разам з юнакамі і дзяўчатамі, якія рабілі толькі першыя крокі па дарозе ў неба. І зноў ён садзіўся ў самалёт, і кожны раз хваляваўся, як у юнацтве, радаваўся сустрэчы з тым, што яму заўсёды было асабліва дарагім.

Л. СУЗІН.

На здымку: Герой Савецкага Саюза І. І. Камінскі.